**106.** Разгледзьце малюнак 12. Назавіце пункты, якія:

а) належаць прамой $b$;
б) не належаць прамой $b$;
в) належаць адрэзку $RS$;
г) не належаць адрэзку $RS$;
д) належаць праменю $HC$;
е) не належаць праменю $CP$.




Мал. 12

## Даследуем

На колькі адрэзкаў разбіваецца дадзены адрэзак трыма пунктамі? Колькі ўсяго адрэзкаў атрымліваецца? Адкажыце на гэта пытанне для $n$ пунктаў.

## § 5. Вымярэнне адрэзкаў. Даўжыня адрэзка

На малюнку 13 адрэзак $AB$ даўжэйшы за адрэзак $CD$. Можна накласці адрэзак $CD$ на адрэзак $AB$ і заўважыць, што ён складае частку адрэзка $AB$, г. зн. адрэзак $AB$ большы за адрэзак $CD$.




Мал. 13

Каб параўнаць адрэзкі, іх можна вымераць. Для вымярэння даўжынь розных адрэзкаў на практыцы выкарыстоўваюць наступныя адзінкі: **міліметр (мм), сантыметр (см), дэцыметр (дм), метр (м), кіламетр (км).**

Залежнасць паміж адзінкамі даўжыні: 1 см змяшчае 10 мм, 1 дм змяшчае 10 см, 1 м змяшчае 10 дм, 1 км змяшчае 1000 м.

Праваўладальнік Адукацыя і выхаванне

1 см = 10 мм
1 дм = 10 см = 100 мм
1 м = 10 дм = 100 см = 1000 мм
1 км = 1000 м = 10 000 дм = 100 000 см = 1 000 000 мм

Пры пераходзе да меншых адзінак даўжыні выконваецца множанне колькасці большых адзінак на 10 (на 100, на 1000 і г. д.).

***Прыклад 1.***

1) 7 м = (7 · 10) дм = 70 дм = (70 · 10) см = 700 см;
2) 12 дм 8 см = 12 дм + 8 см = (12 · 10) см + 8 см = 128 см;
3) 5 км 20 м = 5 км + 20 м = (5 · 1000) м + 20 м = 5020 м.

Пры пераходзе да большых адзінак даўжыні выконваецца дзяленне колькасці меншых адзінак на 10 (на 100, на 1000 і г. д.).

***Прыклад 2.***

1) 80 мм = (80 : 10) см = 8 см;
2) 300 000 м = (300 000 : 1000) км = 300 км;
3) 210 см = (210 : 10) дм = 21 дм = 20 дм + 1 дм = (20 : 10) м + + 1 дм = 2 м 1 дм;
4) 470 000 см = (470 000 : 100) м = 4700 м = 4000 м + 700 м = = (4000 : 1000) км + 700 м = 4 км 700 м.

## Рашаем разам

**107.** Выразіце ў міліметрах, выкарыстаўшы суадносіны паміж адзінкамі вымярэння даўжыні:
а) 8 см, 5 дм, 2 м, 12 см 4 мм, 7 дм 7 см, 16 дм 5 мм, 9 м 13 см;
б) 14 см, 12 дм, 9 м, 8 см 3 мм, 5 дм 7 см, 11 дм 8 мм, 7 м 6 дм 2 см.

**108.** Выразіце ў сантыметрах, выкарыстаўшы суадносіны паміж адзінкамі вымярэння даўжыні:

а) 4 дм, 8 м, 12 км, 60 мм, 5 дм 7 см, 18 м 9 дм, 7 м 3 см;

б) 17 дм, 24 м, 5 км, 900 мм, 13 дм 2 см, 6 м 4 дм, 20 м 500 мм.

**109.** Выразіце ў дэцыметрах, выкарыстаўшы суадносіны паміж адзінкамі вымярэння даўжыні:

а) 7 м, 12 м 4 дм, 80 см, 24 м 4000 см;

б) 15 м, 6 м 8 дм, 700 см, 9 м 60 см.

**110.** Выразіце ў метрах, выкарыстаўшы суадносіны паміж адзінкамі вымярэння даўжыні:

а) 6 км, 800 дм, 3000 см, 17 км 400 м, 200 км 35 м;

б) 14 км, 50 дм, 400 см, 8 км 40 м, 32 км 600 м.

**111.** Выканайце дзеянні:

а) 2 м 7 дм + 16 м 8 дм;

б) 10 см 3 мм − 3 см 6 мм;

в) 4 км − 40 м;

г) 8 м − 8 см.

## Паўтараем

**112.** Запішыце лік, дадзены ў выглядзе сумы разрадных складаемых:

а) $3 \cdot 100 + 7 \cdot 10 + 4$;

б) $8 \cdot 1000 + 2 \cdot 100 + 0 \cdot 10 + 1$;

в) $6 \cdot 10\,000 + 6 \cdot 1000 + 0 \cdot 100 + 6 \cdot 10 + 6$;

г) $5 \cdot 1\,000\,000 + 1 \cdot 100\,000 + 4 \cdot 10\,000 + 9 \cdot 1000 + 8 \cdot 100 +$
$+ 2 \cdot 10 + 7$.

**113.** З аўтастанцыі адначасова ў процілеглых напрамках адправіліся аўтобус і таксі. Скорасць таксі роўна 80 км/г, а скорасць аўтобуса ў 2 разы меншая. Праз колькі гадзін адлегласць паміж імі складзе 120 км?

Праваўладальнік Адукацыя і выхаванне

## Правяраем сябе

1. Назавіце адзінку вымярэння даўжыні, якая:
а) у 1000 разоў большая за метр;
б) у 10 разоў меншая за метр;
в) у 100 разоў большая за метр.

2. Пабудуйце ў сшытку адрэзкі даўжынёй 8 см, 13 см 5 мм, 1 дм 2 см.

3. Пабудуйце ў сшытку адрэзкі $AB$ і $EM$, вымерайце іх даўжыню. Пабудуйце адрэзак, даўжыня якога роўна:
а) даўжыні адрэзка $AB$;
б) суме даўжынь адрэзкаў $AB$ і $EM$.

## Рашаем самастойна

**114.** Выкарыстаўшы залежнасці паміж адзінкамі вымярэння даўжыні, выразіце:
а) у метрах: 8 км, 30 дм, 2000 см, 16 км 20 м;
б) у сантыметрах: 11 дм, 9 м, 10 км, 700 мм, 30 дм 9 см, 1 м 1 дм, 8 м 7 дм 6 см.

**115.** Запішыце колькасць адзінак вымярэння даўжыні ў выглядзе сумы і выразіце:
а) у кіламетрах і метрах: 5280 м, 13 900 м, 600 035 м;
б) у метрах і сантыметрах: 732 см, 907 см, 1020 мм.

**116.** Перайдзіце да адной адзінкі вымярэння даўжыні і выканайце дзеянне:
а) 70 м 17 см + 16 м 8 дм;
б) 2 дм 65 см + 5 дм 9 см;
в) 8 м − 1 м 8 см;
г) 60 км − 60 м;
д) 2 км 30 м − 230 м;
е) 15 см 7 мм − 7 см 5 мм.

## Даследуем

Знайдзіце інфармацыю аб значэнні прыстаўкі «кіла-», вызначце агульнае ў адзінках вымярэння даўжыні і масы з гэтай прыстаўкай. Даведайцеся, што азначаюць прыстаўкі «мега-», «гіга-» ў словах «мегабайт», «гігабайт».